Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 12 Вільня, Панядзелак 30 Сакавіка 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Хрыстос Ускрос! Усім нашым чытачом, супрацоўнікам і прыхільнікам жадаем вясёлых сьвят. Alleluja!

Спробы і варункі.

Падзеі апошніх дзён прынясьлі нам шмат вестак аб спробах польска-ўкраінскага паразуменьня. Гэтыя весткі спачатку былі так ня выразныя, што трудна было прадставіць, хто пачаў гутаркі аб паразуменьні, як далёка яны зайшлі і якія варункі пастаўлены з аднаго боку і з другога. Цяпер-жа пасьля цэлай навальніцы газэтных артыкулаў, калі справа высьвілася, мы можам шырэй затрымацца над гэтымі спробамі.

Спробу паразуменьня зрабілі ўкраінскія паслы. Яны зьвярнуліся да павадыроў Б.Б. Голувкі і Енджэевіча з просьбай звольніць увязьненых падчас „пацыфікацыі" Усходн Галіччыны ўкраінскіх паслоў і прэзыдыюму УНДО, адчыніць закрытыя укр. школы і культурна-прасьветныя ўстановы, а так-жа вярнуць шкоды, зробленыя ўкраінскім коопэратывам войскам і паліцыяй пры „пацыфікацыі" (усьмірэньні). Павадыры Б.Б. згадзіліся на гэтыя просьбы пад варункам: 1) выражэньня ўкр. пасламі лёяльнасьці адносна Польскай дзяржавы і 2) адклікаьня скаргаў пададзеных на Польшчу ў Лігу Народаў у сувязі з „пацыфікацыяй". Украінцы на такія варункі не згадзіліся і гутаркі былі прарваны.

Гэтак прадстаўляецца „ход" польска-ўкраінскіх перагавораў. Але нас цікавіць тут ня сам ход перагавораў — нас болей цікавяць далейшыя варункі, якія паставіў п. Голувко ў афіцыяльнай газэце пілсудчыкаў „Gazeta Polska". Вось-жа п. Голувко ў стацьці, зьмешчанай у гэтай газэце, піша паміж іншым так: „Украінскае грамадзянства павінна зразумець, што даўнейшая Чарвенная Русь (Усх. Галіччына), якая праз 600 гадоў належала за Польшчы, паддалася глыбокаму ўплыву польскай культуры і яна сталася краем мяшаным польска-ўкраінскім. Дзеля гэтага ўкраінцы павінны згадзіцца з тым, што гэты край стаўся суцэльнай часткай Польшчы і што ўсе надзеі на перамену палажэньня ёсьць зводнымі".

Значыць, паводле п. Голувкі, Усходн. Галіччына не атрымае нават аўтаноміі, якую Польшча забавязалася ўвясьці на моцы пастановы Рады Амбасадараў з дн. 15 III.1923 году, дзе сказана даслоўна так: „Польшча прызнала, што адносна ўсходняй часткі Галіччыны этнографічныя варункі робяць канешным аўтанамічны строй". Дык першым варункам цяперашняй польскай палітыкі адносна ўкраінцаў было-б зрачэньне правоў нават да аўтаноміі.

Другім варункам была-б згода з польскім насельніцтвам Усходн. Галіччыны. У чым гэта згода мела выражацца і якіх вымагаць ад украінцаў уступак — аб гэтым п. Голувко нічога ня кажа і гэтым самым дае польскаму насельніцтву ў Усходн. Галіччыне шырокія магчымасьці ставіць украінцам шырокія варункі. А ведаючы настроі польскага насельніцтва адносна ўкраінцаў, няма што сябе ашуківаць спадзяючыся лёгкіх варункаў, тым болей, што паводле слоў п. Голувкі „усе надзеі ўкраінцаў на перамену палажэньня ёсьць зводнымі".

Гэтакія будуць варункі п. Голувкі пастаўленыя ўкраінскаму грамадзянству. А цяпер пытаньне, што-ж адносна беларусаў?

У беларускай справе п. Голувко выражаўся ўжо няраз і мы яго пагляды падавалі ў нашай газэце. Гэтыя пагляды дужа простыя і зводзіліся да таго, каб адабраць ад беларусаў народную душу і ўсё будзе добра... Гэтакі зьмест усіх заяваў п. Голувкі ў беларускай справе.

Цяпер-жа загаварыў адзін з павадыроў беларускай санацыі п. Астроўскі. Гэты, даўней грамадаўскі, а цяпер санацыйны дзеяч, на сабраньні ў Польскім Грамадзкім Клюбе і на зьезьдзе польскіх санацыйных паслоў Б. Б. у Вільні 27. III. сёл. г. меў рэфэрат аб польска-беларускіх адносінах (гл. „Кур. Віл." № 68 з дн. 24. III. 31 г. і „Наше Время № 73 з дн. 29. III. сёл. г. У гэтым рэфэраце п. Астроўскі прадусім распісаўся ў лёяльнасьці прад Польскай Дзяржавай, а потым дамагаўся адкрыцьця беларускіх школ, помачы для бел. гімназіяў і г. д. У сваім рэфэраце п. Астроўскі нічога новага не сказаў, а толькі паўтарыў ужо няведама каторы раз пажаданьні беларускай санацыі. Найцікавейшы будзе канец гэтага рэфэрату, дзе п. Астройскі прасіўся ў паноў палажэньня, каб не застаўлялі лізаць ботаў.

На гэтыя свае дамаганьні і на гэту просьбу п. Астроўскі і цяпер не атрымаў ніякага адказу. Відаць, паны палажэньня рашылі, што няма з кім гаварыць. Калі польскія ўрадавыя кругі аднесліся з цэлай павагай да ўкраінскіх пажаданьняў, то з стаўпом беларускай санацыі не хацелі нават гаварыць.

Тут спраўдзілася тая польская прыказка, у каторай гаворыцца, як гэта дзед гаварыў да абразу, а вобраз да яго ані разу...

Яшчэ нас цікавіць тут ня колькі сам факт перагавораў украінцаў ці санацыйных беларусаў з польскімі ўрадавымі кругамі, колькі цікавіць нас сам падыход гэтых кругоў да вырашэньня ўкраінскага і беларускага пытаньня ў Польшчы.

Вось-жа ў справе беларускай урадавыя польскія кругі маўчаць, а ў справе ўкраінскай мы маем ужо ясныя варункі пададзеныя ў вышэй успомненай стацьці п. Голувкі і якія могуць быць перакінены і на беларускі грунт. А ў гэтых варунках, як мы ведаем, няма нават гутаркі аб аўтаноміі, няма гутаркі аб чыста ўкраінскіх абшарах, няма ўспаміну нават аб культурна-нацыянальнай аўтаноміі, зямельнай рэформе на карысьць украінцаў, аб свабодным самаўрадзе — ёсьць толькі аб лёяльнасьці да Польскай дзяржавы, аб паразуменьні з польскім насельніцтвам і аб поўным маўчаньні аб сваіх крыўдах прад Лігай Народаў.

Значыць этапы польскай палітыкі на ўкраінскіх і беларускіх землях паводле пляну п. Голувкі такія: пры помачы колёнізацыі, асадніцтва і полёнізацыі зрабіць гэтыя землі этнаграфічна мяшанымі; на абшарах з мяшаным украінска-польскім ці беларускім насельніцтвам ня ўводзіць ніякай аўтаноміі, а ўсё ўзалежніць ад голасу мясцовага польскага насельніцтва; забараніць жаліцца і выносіць свае крыўды прад сьветам.

Гэта мае быць „рэальная" палітыка п. Голувкі. І гэта палітыка мае праводзіцца з усёю консэквэнтнасьцю. Прыглядаючыся да яе бліжэй, трэба прызнаць, што мы беларусы знаходзімся ў першым этапе гэтага пляну польскай палітыкі: нашы землі, ня выключаючы Палесься, робяцца „мяшанымі", а ўкраінцы ў Усходн. Галіччыне знаходзяцца ўжо ў далейшых этапах: ім п. Голувко адмаўляе права на аўтаномію і нават падаваньне скаргаў у Лігу Народаў, а лёс іхны ўзалежняе ад гэтай польскай часткі насельніцтва, якая зрабіла край мяшаным...

Дык прад гэткай палітыкай п. Голувкі хай будуць чуйнымі тыя беларускія дзеячы, якія стаяць на незалежным шляху і няхай усе чэсныя беларусы з агідай адвернуцца ад прадажніцкай і лякайскай работы Астроўскага, Луцкевіча і кумпаніі.

ХРЫСТОС УСКРОС!

Хрыстос Ускрос! І чутна звонка
Анёлаў песьня з-пад нябёс.
Паўсшань і Ты, мая Старонка,
Із беднаты і мора сьлёз!

Руч'і бурляць... сінеюць далі...
Прырода будзіцца са сну.
Уставайце ўсе, што мёртва спалі,
Вітаць прыйшоўшую вясну!

Ня плач, Народ! Хрыстос паможа
І ты ускрэсьнеш так, як Ен,
Ен сілы дасьць і ты ўсё зможаш —
Нядоля пройдзе, як той сон.

КОКО.

Сьвяткаваньне трынаццатых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў Вільні.

Беларускі Нацыянальны Камітэт, як установа прадстаўніцтва беларускага народнага адраджэнскага руху ў Заходняй Беларусі, на агульным сходзе дня 22 лютага с. г. пастанавіў і сёлета за прыкладам мінулых гадоў адсьвяткаваць урачыста дзень Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі ў 13-ую гадаўшчыну.

Прэзыдыюм Бел. Нац. К-ту дня 17 сакавіка с. г. выдаў камунікат да народу, паведамляючы, што дня 25 сакавіка с. г. прыпадае дзень Вялікага Беларускага Народнага Сьвята — 13-ыя ўгодкі Абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, падаючы праграму сьвяткаваньня ў Вільні.

Паводле загадзя ўстаноўленай Прэзыдыюмам Бел. Нац. К-ту праграмы, сьвяткаваньне 13-х угодкаў Абвешчаньня Нязалежнасьці Беларусі ў Вільні пачалося ў нядзелю 22 сакавіка набажэнствамі: у касьцеле сьв. Мікалая і ў царкве сьв. Мікалая.

У нядзелю 22 сакавіка а гадзіне 10 раніцы ў касьцеле сьв. Мікалая, куды зышліся ўсе выдатныя беларускія народныя дзеячы, прадстаўнікі літоўскага грамадзянства, а так-жа даволі вялікая лічба віленскіх беларусаў каталікоў, ведамы беларускія дзеяч народнік кс. А. Станкевіч адправіў урачыстую Імшу, у часе каторай народ сьпяваў беларускія рэлігійныя песьні пад акампаніямант аргану. Пасьля Імшы кс. Вінцэнты Гадлеўскі, ведамы змагар за беларускую народную справу, вельмі красамоўна сказаў глыбока прадуманае казаньне да народу, заклікаючы да народнай еднасьці, да напружаньня ўсіх сіл фізычных і маральных народу, каб перарываць сучасны вель

мі цяжкі для беларусаў час. Па заканчэньні казаньня, народ запяяў беларускі рэлігійны гымн „Божа, што калісь народы на асобкі падзяліў“.

У той самы дзень а гадзіне 12 і 30 мінут пачалося набажэнства ў царкве сьв. Мікалая. У прысутнасьці ўсіх выдатных беларускіх народных дзеячоў і вялікага ліку віленскіх праваслаўных беларусаў сьвяшчэньнік Кушнёў у прыгожых словах сказаў пабеларуску адпаведную ўрачыстасьці пропаведзь, заклікаючы беларусаў да хрысьціянскай любові і брацкае еднасьці. Пасьля пропаведзі сьвяшч. Кушнёў у асысьце дыякана адправіў малебен, у часе каторага пяяў мясцовы царкоўны хор.

У сераду 25 сакавіка с. г. а гадзіне 7 і 30 мінут у салі дому № 1 пры Завальнай вуліцы пачалася ўрачыстая акадэмія ў наступным парадку.

На запоўненай народам салі між іншымі былі прадстаўнікі братніх: літоўскага і ўкраінскага народаў— старшыня Тымч. Літ. К-ту ў Вільні п. К. Сташыс, прадстаўнікі ўкраінскага і літоўскага студэнства і другія.

На эстрадзе прад Пагоняй, удэкараванай беларускімі нацыянальнымі бела-чырвона-белымі сьцягамі, за прэзыдыяльным сталом заняў месца прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага К-ту — старшыня В. Багдановіч, віцэ-старшыня пас. Ф. Ярэміч, сэкрэтар Я. Пазьняк і рэфэрэнт акадэміі інж. А. Клімовіч.

Акадэмію адчыніў старшыня Нац. К-ту В. Багдановіч кароткай прамовай, у часе каторай на ягоную прапазыцыю ўсе прысутныя ўшанавалі памяць памёршых змагароў за беларускую незалежнасьць уставаньнем з мейсца. У гэты мамэнт хор Віл. Аддзелу Бел. Інст. Гасп. і Культуры пад кіраўніцтвам Я. Пешкі прапяяў беларускі нац. гымн „Непагаснуць зоркі ў небе.“

Па прапяяньні гымну інж. А. Клімовіч прачытаў рэфэрат на тэму „Шляхам Незалежнасьці“.

Пасьля рэфэрату пачаліся прывітаньні. Першы вітаў ад Літоўскага народу старшыня Тымч. Літоўскага К-ту ў Вільні грам. К. Сташыс, які прамову сваю па літоўску аб сужыцьці беларускага і літоўскага народу закончыў па беларуску наступнымі славамі: — „Няхай зрэалізуецца думка і воля Беларускага народу, няхай станецца Беларускі народ незалежным“.

Наступны прамоўца ўкраінец студэнт Крахмалюк Васіль ад імя ўкраінскага студэнства ў прамове па ўкраінску падкрэсьліў значэньне саюзу між народамі ўкраінскім і беларускім, абрысоўваючы сучасны цярністы шлях, як украінскага, так і беларускага народаў; закончыў ён сваю прамову наступнымі славамі: — „хоць і цярністым шляхам, але Беларускі народ да незалежнасьці дойдзе.“

Прадстаўнік Літоўскага Студэнскага Саюзу студэнт Марцінкенас вітаў ад літоўскай моладзі Беларускі народ прамовай па літоўску; закончыў сваю прамову па беларуску: — Няхай жыве літоўска-беларускае сужыцьцё“.

Пасьля прывітаньняў ад прысутных на акадэміі гасьцей, былі прачытаны прывітальныя тэлеграмы і пісьмы.

Беларуская студэнская моладзь, здабываючая вышэйшую асьвету заграніцамі сваей Бацькаўшчыны і ў Краю, зарганізаваная ў студэнскія арганізацыі і аб‘яднаная ў агульны саюз „Аб‘еднаньне Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў“ („АБСА“), цэнтраля якой знаходзіцца ў Празе Чэскай, вітае свой народ у асобе Беларускага Нацыянальнага К-ту ў гэты Вялікі дзень Беларускага Народнага Сьвята тэлеграмай наступнага зьместу:

Беларускі Нацыянальны Камітэт
Вільня Людвісарская 1—19

Са сьвятакаваньнем АБСА вітае. Няхай жыве вольная Беларусь

Прага 24.III.1931.

Атрымаў такжа Бел. Нац. К-т прывітальныя пісьмы і тэлеграмы ад: праф. Віл. Унівэрсытэту В. Станевіча, кс. др. Кладочнага, інж. В. Лаўскага, Я. Быліны і другіх.

Урачыстая акадэмія закончылася канцэртам і дэклямацыямі.

Хор Віл. Аддзелу Б. І. Г. і К. пад кіраўніцтвам б. пасла П. Карузы выканаў прыгожыя 3 народныя беларускія песьні ў гарманізацыі рэгента і прапяяў адну народную бел. песьню пад кіраўніцтвам грам. Я. Пешкі. Ведамая сьпявачка п. Ганна Душэўская прыгожа прапяяла солё 3 народныя беларускія песьні аранжароўкі П. Карузы і арыю з опэры „Гугеноты“ пад акампаніямант П. Карузы.

У часе перарываў вокальных імпрэзаў вучань Будаўлянае Школы Крывец і вучаніца Віл. Бел. Гімназіі А. Шутавічанка з пад‘ёмам духа дэклямавалі патрыётычныя вершы.

—о—

Сьвяткаваньне 13-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі даволі яскрава паказвае, што ў народзе Беларускім незалежніцкая ідэя разьвіваецца і паглыбляецца. Беларускае грамадзянства, якое не атруціла сваей душы таннымі прысмакамі пагарднае службы сільным гэтага сьвету, знайшло правільны шлях да сьветлае будучыні Беларускага народу і па ім з гордасьцяй і сьмела крок за крокам паступае ўперад. Гэтае сьвяткаваньне яскрава сьведчыць і аб бясcільнасьці натугаў з боку полёнофільскага „Цэнтрасаюзу“, які час ад часу робіць спробы, каб разьбіць беларуска-ўкраінска-літоўскі саюз і заглушыць ідэю Беларускага народу, якую рэпрэзэнтуе Беларускі Нацыянальны Камітэт.

П—к.

З Беларускага жыцьця.

Дыскусыйны вечар. У апошнія часы стараньнем Віл. Аддзелу Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ладзяцца амаль кожную нядзелю ў памешчаньні Ц. У. Інстытуту лекцыі і дыскусіі. У нядзелю 22 г. м. мелася адбыцца лекцыя аб сьв. Парасцы Полацкай, але лектар грам. Ліпскі з незалежных ад яго прычын гэтую лекцыю адлажыў надалей, а замест лекцыі адбыліся дыскусіі на вольныя тэмы.

Канфіскату зьнялі. Прамова пасла Ф. Ярэміча, якая 14 лютага с. г. была сканфіскавана адміністрацыйнымі ўладамі, атрымала правы публічнасьці.

Ой узгадаваньне, узгадаваньне! — уздыхаючы часта кажа беларус, асабліва які мае сваіх дзяцей у Віленскай Беларускай Гімназіі. Так, так! Шмат аб гэтым трэба было-б пісаць, але адложым гэта на іншы час. Цяпер толькі прыпомнім апошнюю красачку з муроў тэйжа гімназіі. Вось-жа 25. III. сёл. г. беларускія полёнофілы ў салі гімназіі зладзілі вечар. На гэты вечар загнаныя былі вучні, каб прадстаўлялі з сябе публіку, якой, рэч ясная, было дужа мала. Лекцыю на гэтай вечарыне чытаў сам главар беларуска-польскай угоды Антон Луцкевіч. Вось-жа гэты лектар дапусьціўся нізкай і подлай ілжы адносна беларускага грамадзянства і лаянкі яго за тое, што яно крытычна адносіцца да яго пастаянных палітычных афэраў. Пэўне-ж, дзівіцца з гэтага, знаючы Луцкевіца, ані гневацца на яго няма ніякай патрэбы. Яшчэ ўчора ён выхваляў бальшавікоў, сяньня ён верны іншаму пану, а заўтра ён прыдумае нешта новае. Але ўся справа тут у тым, што Луцкевіч — вучыцель гімназіі, што лекцыю сваю чытаў ён так жа ў гімназіі і пераважна да сваіх вучняў. Вось-жа беларускую гімназіяльную моладзь Луцкевіч, як вучыцель, ужывае цынічна дзеля сваіх палітычных афэраў, цкуючы яе на беларускае грамадзянства, прыпісваючы яму тое, у праўдзівасьці чаго моладзь ня ў сілах разабрацца. Гэта сапраўдная сьмярдзякоўшчына!

Граматыка Тарашкевіча лацінкай. Давёдываемся, што беларуская санацыя выдала беларускую граматыку Тарашкевіча лацінкай і вялікі лік экзэмпляраў прадала Віленскай Школьнай Кураторыі.

Выстаўка абразоў і фатаграфіяў этнаграфічна-краязнаўчага зьместу адбывалася ў памешканьні Беларускага Музэю праз два дні — 28 і 29 сакавіка с. г. Экспанаты: — абразы беларускага мастака Я. Драздовіча і фатаграфіі грам. Грыневіча — беларуска-этнаграфічнага зьместу даволі добра ілюструюць этнічны характар нашага беларускага краю ўлучна з Палесьсем.

Новая кніжка. Гэтымі днямі выйшла з друку другім накладам пасьля канфіскаты кніжка Б. Скарыніча аб зьбіраньні геаграфічных беларускіх назоваў.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ НА ЭМІГРАЦЫІ.

Сьвята незалежнасьці. Т-ва Беларуская Рада ў Празе Чэскай у 13 угодкі Абвешчаньня незалежнасьці Беларусі дня 25. III. с. г. наладзіла ўрачыстае сьвяткаваньне. На ўрачыстай акадэміі, якая адбылася ў салі (Прага II, Легерова 3.) грам. В. Захарка прачытаў рэфэрат на тэму „Сучаснае становішча Беларусі“.

„Беларуская Трыбуна“. Пасьля нядоўгага перарыву ўзноў пачала выходзіць у Амэрыцы ў Шыкаго беларуская газэта пад назовам „Беларуская Трыбуна“. Рэдактарам гэтай часопісі ёсьць ведамы беларускі дзеяч Язэп Варонка.

„Беларуская Трыбуна“ прасякнута ідэолёгіяй незалежніцкай; за шлях да мэты выбрала яна супрацоўніцтва з украінцамі і літвінамі.

Прыязьнь кіраўнікоў „Беларускай Трыбуны“ з амэрыканскімі ўкраінцамі пацьвярджае амэрыканская ўкраінская газэта „Украіна“, якая вітаючы паяўленьне „Б. Т.“, між іншым піша — „Мы шчыра яе вітаем, бо кожны здабытак беларусаў, гэта здабытак нашага саюзьніка, гэта, інакш кажучы, здабытак наш“.

Як бачым, беларуска-ўкраінскі саюз замацоўваецца сярод беларусаў і ўкраінцаў і ў Амэрыцы.

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Масавыя арышты сярод беларусаў. Газэты падаюць, што дня 23 сакавіка с. г. з Усходняе часьці Беларусі ўцяклі ад бальшавікоў праз бальшавіцка-польскую граніцу ў Зах. частку Беларусі два беларусы. Гэтыя ўцякачы расказваюць, што камуністычныя ўлады з прычыны 13 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі дакаталі масавых арыштаў сярод беларусаў. Арышты адбыліся быццам у сувязі з выкрыцьцём контрэвалюцыйнай арганізацыі ў Менску і іншых гарадох Беларусі, якая ў дзень незалежнасьці — 25.III. быццам мела на мэце паднясць збройнае паўстаньне і абвесьціць Беларусь самастойнай і незалежнай ад Саветаў.

Справа не партыйная, а народная!

„Кур. Віл.“ (№ 70 з 26. III. с. г.) з нагоды сьвяткаваньня 13 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі радзіць нам абходзіць народныя сьвяты разам з беларускай полёнофільскай ці так зв. санацыйнай групай. З гэтай рады мы робім вывад, што Рэд. „Кур. Віл.“ нас не разумее, або ня хоча зразумець. Справа ня ў супольнасьці сьвяткаваньня, а справа ў абставінах, пасярод якіх абходзіцца гэтае сьвяткаваньне. Мы абходзім гэтыя сьвяткаваньні як грамадзяне sui juris, маючыя паўнату свабоды ў сваіх дамаганьнях да незалежнасьці. Ня тое ў беларускіх полёнофілаў: іх сьвяткаваньні і іх імкненьні да незалежнасьці ёсьць маральна залежнымі ад пэўных дзейнікаў, якія пэўне-ж Рэдакцыі „Кур. Віл.“ ведамы.

У польскім грамадзянстве за часоў няволі былі таксама розныя ўгадовыя кірункі. Былі нават „катарыняжэ“, якія хадзілі складаць чэсьць тэй царыцы, каторая прынясла найбольшую крыўду Польшчы. Мы нават на мінуту не дапускаем тэй думкі, каб рэдактары або супрацоўнікі „Кур. Віл.“ маглі далучыцца пры сьвяткаваньні польскага народнага сьвята да тае групы, якая йшла на ўгоду з крыўдзіцелямі польскага народу.

Тут справа не партыйная, а народная — затым і мы разам з беларускай санацыяй сьвяткаваць ня можам.

З Польшчы.

З Сойму і Сэнату. Сэсія польскага парляманту дня 21 сакавіка с. г. закрыта. На калі будзе склікана, пакульшто няма ведама.

Маршалак Пілсудзкі ў нядзелю 29 сакавіка прыехаў у Варшаву з Мадэры. Па Пілсудзкага на Мадэру быў высланы спэцыяльна польскі вайсковы карабель, якім Пілсудзкі прыплыў па вадзе з Мадэры да польскага порту ў Гдыні.

Значэньне для Польшчы мытнага саюзу Аўстрыі з Нямеччынай. Польскія газэты пішуць, што аўстрыйска-нямецкі мытны саюз закрые саўсім венскі рынак збыту сьвіней з Польшчы.

Дзяржаўны буджэтны дэфіцыт за м-ц люты. У месяцы лютым с. г. у дзяржаўным буджэце не стачыліся канцы з канцамі. Расход перавышыў даход на 12.000.000 злотых.

ГРАМАДЗЯНЕ!
Засноўвайце гурткі Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

АХВЯРЫ
камуністычнага тэрору ў Усходняй Беларусі.

Янка Купала, найвялікшы беларускі паэт-прарок, які змушаны быў камуністычным тэрорам да самагубства.



Прафэсар Ігнатоўскі, быўшы прэзыдэнт Бел. Навук Акадэміі ў Менску, які пакончыў з сабой самагубствам, ня могучы перажыць камуністычнага тэрору.

Ад. Клімовіч.

Шляхам Незалежнасьці.*)

Сягоньня з усходам сонца кончылася трынаццаць гадоў ад часу, калі ўсяму сьвету была абвешчана воля Беларускага народу быць незалежным. Гэты колектыўны акт волі нашага народу, першы ў сваім родзе ад часу з-прад 5-цісот з лішнім гадоў, мае вялікае значэньне ня толькі гістарычнае, але і грамадзка-палітычнае, ня толькі народнае, але і міжнароднае, ня толькі тэорэтычнае, але і жыцьцёва-практычнае. Таму гэты акт мае першарадную вартасьць і таму, хоць дагэтуль ня стаўся фактам, поўнасьцю заслугоўвуе быць успамінаным і культываваным так доўга, як доўга існуе Беларускі народ. Нават дзень, у каторым беларуская потэнцыяльная энэргія, перарадзіўшыся ў кінэтычную, паставіць некалі — мы ў гэта моцна верым — увесь сьвет прад фактам дакананым, нават гэты дзень можна будзе паставіць толькі побач з днём 25. III. 18 г., але ніколі не на ягонае месца.

Самыя падзеі дня 25. III. 18 г. даволі вядомы... Цікавейшым мо' будзе адсьвежыць у памяці гістарычныя мамэнты давёўшыя народ наш да сьведамасьці сваей волі, а галоўнае — усьведаміць і праверыць дзеючыя сілы і спружыны сучаснага беларускага жыцьця.

Калі сяньня задаём сабе пытаньне, чаму 13 гадоў таму назад абвешчаная Незалежнасьць Беларускага народу да сягоньня астаецца толькі ў думках — лятуценьнях, а найбольш — на словах, дык паўстае другое пытаньне: якія сілы папхнулі й змусілі прадстаўнікоў Беларускага народу прад 13-цю гадамі ўздабыцца на акт такой важнасьці, як акт волі да Незалежнасьці? Абодва гэтыя пытаньні, у сувязі з найнавейшымі развашаньнямі аб элемэнтах колектыўнай душы Беларускага народу: пачуцьця, інтэлекту і волі, ставяць трэцяе вельмі важкое пытаньне, ці акт 25. III. 18 г. наагул быў актам волі Беларускага народу, ці мо' гэта была толькі стыхія, аперціся каторай нашы прадстаўнікі не пачуваліся на сілах?

Пачнём ад апошняга. Перанясёмся думкамі ў тую пару і ў тагочасныя абставіны. Царат звалены. Усё жывое напірае на жыцьцё, формы якога множацца быццам грыбы пасьля дожджу. Што ўчора было на часе, сягоньня зьяўляецца перажытым. Праграмы сягоньня максымалістычныя, заўтра стаюцца за вузкія, неадпавядаючыя духу пары. Усе суседзі навокал абвесьцілі сваю незалежнасьць. Беларускія праграмы культурнай, пасьля і тэрыторыяльнай аўтаноміі бледнуць перад падзеямі дня. Трэба нечага больш. Склікаецца Усёбеларускі Зьезд на 5-га сьнежня 1917 г., павадыры якога і здалёку ня былі хіба пэўнымі рэзультатаў, у якія выльецца ягоная праца. І толькі 10 дзён (да 18. XII.) упорнага змаганьня з выразнай процiволяй, ня хочачай дапусьціць да вольнасьці самаазначэньня Беларускага народу, выкоўвывае ў прысутных станаўкую большасьць, якая ўжо выразна і сьведама імкнецца да Незалежнасьці. А калі ў тры з лішнім месяцаў пасьля гэтага даходзіць да самага акту Абвешчаньня Назалежнасьці, як цьвердзяць учасьнікі, ня хто іншы, як кіраўнікі гэтай-жа выкаванай незалежніцкай большасьці трасуцца, трасуцца ня то з радасьці, ня то страху... Нельга тут падробна прааналізаваць а тымбольш —ацаніць тагочасных настрояў, нельга асабліва гэтага зрабіць таму, хто гэтага асабіста і беспасярэдна не перажыў, ня бачыў. У кожным разе сьмею цьвердзіць, што гэты мамэнт нашага адраджэньня заслугоўвуе на бліжэйшае распазнаньне, тымбольш, што г. зв. „падручныя факты“ пакідаюць цэлую справу даволі цьмянай. Для тых аднак, хто хацеў-бы з няяснай тагочаснай сытуацыі проста выводзіць адсутнасьць волі ў Беларускага народу да Незалежнасьці, трэба ўспомніць, што не адны толькі Беларусы не дайшлі да назначанай сабе мэты: усе народы Каўказу, а нават Украінцы падзяляюць горкую долю разам з намі. А ня бачыць волі да незалежнасьці ў гэтых народаў нельга.

Ужо гэтым самым у значнай меры будзе адказана на першае пытаньне, чаму наша незалежнасьць дагэтуль ня зьдзейсьнена: ня толькі матэрыяльнае багацьце, ня толькі духовая прыгатаванасьць маюць н... гэта вялікі ўплыў — важным тут ёсьць м... народнае палажэньне, а прадусім дабра... насьць найбліжэйшых суседзяў. Гэта ... няе фатальна адбілася як на Белару... на Украіне, на абшары каторых кр...

*) Рэфэрат прачытаны 25 г. м. на ўрачыстай Акадэміі, прысьвячанай 13-тым угодкам Абвешчаньня Незалежнасьці Б. Н. Р.

У 15-ыя ўгодкі сьмерці Цёткі.

5-га лютага мінула 15 гадоў ад сьмерці (5. II. 1916) беларускай паэткі і дзеячкі Алёізы Пашкевічанкі (па мужу Кейрыс), пісаўшай свае творы пад мянюшкай Цёткі.

Радзілася Цётка ў беларускай дробнашляхоцкай каталіцкай сям'і ў 1876 г., Васіліскай гм., Лідзкага пав. Спачатку вучылася яна ў Вільні, дзе (1901 г.) скончыла гімназію, пазьней (1902-1903) на вышэйшых курсах Лесгафта ў Пецярбурзе, і ўрэшце ў Кракаўскім унівэрсытэце на гуманістычным аддзеле. У Кракаве (1908-1909) Цётка прабывала як палітычная эмігрантка, крыючыся ад вока расейскай царскай паліцыі з прычыны сваей беларускай нацыянальна-рэвалюцыйнай дзейнасьці.

Сваю літэратурную, грамадзкую і рэвалюцыйную працу пачала Цётка будучы студэнткай.

Літэратурныя творы былі сьпярша выданы заграніцай у 1906 г. у васобных кніжыцах: „Скрыпка беларуская“ і „Хрэст на свабоду“, друкаваныя гражданкай і лацінкай.

Друкавала так-жа Цётка свае творы і ў часопісях, як „Наша Ніва“ (1908-1910), „Маладая Беларусь“ (1912-1913) і „Лучынка“ (1914 г.).

Уся літэратурная творчасьць Цёткі выразна дзеліцца на два пэрыяды: на пэрыяд рэвалюцыйны (1904-1905), у якім пясьнярка з вялікай сілай выступае проціў царскага ўціску падняволеных народаў і працоўных масаў, — і на пэрыяд нацыянальны (1906-1916), калі Цётка ўсю душу сваю пасьвячае справе беларускага народнага адраджэньня і вызваленьня.

Але бадай больш, як працай літэратурнай, займалася Цётка працай грамадзкай.

У пэрыядзе рэвалюцыйнага захопленьня бачым Цётку пры ідэйнай працы сярод работнікаў: на зборках, нарадах, на вечах у ролі сумленнага працаўніка і гарачага прамоўцы; у пэрыядзе ўзноў позытыўнай нацыянальнай працы спатыкаем Цётку пры арганізаваньні беларускага тэатру ў Вільні, пры пісаньні першага беларускага лемэнтара, пры закладаньні беларускіх пачатковых школ; урэшце, падчас сусьветнай вайны, спатыкаемся з Цёткай, як сястрой міласэрдзя, якая, служа людзкой нядолі і аднačасна вядзе беларускую работу, усьведамляючы нацыянальна жаўнераў.

Ня чужыя былі такжа для Цёткі і праблемы рэлігійныя, насколькі яны былі зьвязаны з жыцьцём, з беларускімі грамадзка-народнымі ідэаламі. Цікавы, напрыклад, яе пагляд на справу рэлігійнай уніі на Беларусі. Будучы ў Львове (1906-1907) падчас сваей прымусовай эміграцыі, Цётка між іншым так піша ў Пецярбург да праф. Бр. Эпімах-Шыпілы:... „Цяпер жыву я ў Львове, з украінцамі-русінамі і ўніятамі заваджу



Алёіза Пашкевіч — Цётка, беларуская паэтка ад сьмерці якой (†1916) мінула сёлета 15 гадоў.

знаёмства... Скора вышлю кніжкі аб уніі для акадэмікаў духоўных на Ваш адрэс. Вы, шаноўны прафэсар, закіньце перад імі слова за унію... Унія для беларусаў была-б крэпкай падпорай, бо лацінскае духавенства ў нас на ніштo“.

Так, Цётка, як бачым яе ў літэратурных творах і ў грамадзкай дзейнасьці, — гэта сапраўды вялікая беларуская душа. Яна пару гадоў была захапіўшыся рэвалюцыйнымі імкненьнямі. Паводзе няслушнага ў нас разуменьня — быць рэвалюцыянэрам — гэта тое, што стацца соцыялістам-марксыстам, а сяньня — камуністым, гэта тое, што справы народу свайго падпарадкаваць работніцкай, фабрычнай клясе, у нашых варунках у сэнсе беларускім бадай цалком вынарадоўленай, гэта ўрэшце тое, што цалком адрачыся беларускіх нацыянальных ідэалаў. Вось-жа вялікая і бязьмерна патрыётычная душа Цёткі і гэтую недарэчнасьць разумела і ей не паддалася. Уся рэвалюцыйнасьць Цёткі ніколі ня была самамэтай, а была ў ёй заўсёды толькі складовай, ня істотнай часткай яе народных імкненьняў і ідэалаў. Рэвалюцыйнасьць Цёткі — гэта прадусім мэтода барацьбы за вызваленьне беларускага народу.

Калі-ж урэшце шукаць уплываў ідэёвых на Цётку і духовага яе сваяцтва з кім у беларускай літэратуры, дык мусім затрымацца на Фр. Багушэвічу. Як грамадзка-патрыётычны зьмест твораў Цёткі і форма іх, таксама назоў зборніка „Скрыпка Беларуская“ на падабенства Багушэвічавых Смыка і Дудкі — выразна нам паказваюць, што Цётка — гэта родная і годная дачка патрыархі беларускага адраджэньня — Фр. Багушэвіча. Рожніцца яна ад свайго духовага бацькі, што цалком прыродна і зразумела, большай энэргіяй, энтузыязмам, жывейшым і выразьнейшым нацыянальным матывам. У гэтым асаблівасьць Цёткі і ў гэтым, дзякуючы ей далейшы этап беларускай адраджэнскай думкі, зроджанай Багушэвічам.

А. Сакалінскі.

З заграніцы.

Страх прад злучэньнем Аўстрыі з Нямеччынай. У палавіне сакавіка с. г. аўстрыйскія газэты апублікавалі вестку аб заключэньні Аўстрыі з Нямеччынай мытнага саюзу. Здаецца, — штож такое, што дзьве часьці народу, разьдзеленыя граніцай „мірных“ дагавораў, паразумеліся між сабою ў гаспадарскіх справах дзеля паляпшэньня іхняга цяжкога гаспадарчага палажэньня. Тымчасам гэтая вестка нарабіла такога шуму ня толькі ў ва ўсей Эўропе, але нават у ва ўсім палітычным сьвеце, што абапэрлася аб Лігу Народаў. Тыя дзяржавы, якія праціваяцца аб'яднаньню Нямеччыны з Аўстрыяй, уважаючы мытны саюз падгатоўкай да так зв. „аншлюсу“ (аб'еднаньня), пачалі дамагацца ў гэтай справе высьненьня. Нямеччына заявіла, што яна даць у гэтай справе высьненьне не адмовіцца. Газэты заграбічныя ніяк ня могуць аб гэтых вестках уціхамірыцца, робячы розныя дагадкі.

Яшчэ адна палітычная сэнсацыя. Француская газэта „Paris—Midi“ нядаўна апублікавала вестку, што нямецкі ўрад неўзабаве мае пацняць справу рэвізіі ўсходніх граніц, датарноўваючы гэту справу да часу, калі мае сабрацца сусьветная конфэрэнцыя дзеля разбраеньня.

Паводле гэтае весткі, нямецкі ўрад уважае вырашэньне гэтае справы так: Польшча для Нямеччыны адступіць паморскія землі да ракі Нотэць. Нямеччына загварантуе для

адвечныя ўплывы суседзяў з найбліжэйшага заходу і ўсходу.

Падходзім урэшце да пытаньня на сяганьня апошняга і найважнейшага: якія сілы папхнулі й змусілі Беларусаў у 1918 г. да акту Незалежнасьці? Каб адказаць на гэта пытаньне, трэба ўсьведаміць сабе эволюцыйны поступ грамадзкай думкі аб разьвіцьці нацыі і аб ейным праве на незалежнае існаваньне агулам.

Калі, ад якога часу датуецца паняцьце нацыі ў сяньняшнім гэтага слова значэньні? Адказваючы на гэта пытаньне большасьць гісторыкаў паказуе на пару Вялікай францускай рэвалюцыі. Аднак ёсьць пэўныя даныя дашуківацца гэтых пачаткаў у самым зародку навейшай гісторыі: часы, калі чэскімі землямі трос Ян Гус і ягоныя суверніці, часы германскай і романскай рэформацыі надта напамінаюць найнавейшыя змаганьні за самабытнасьць паасобных народаў. І калі гэтыя-ж думкі і ідэалы знашлі такі водгук у пару Вял. францускай рэвалюцыі, то гэта пацьвярджае толькі, што яны былі ўжо выкліканы да жыцьця значна раней і драмалі ў народзе толькі дзякуючы няспрыяючым варункам.

Т. Врублеўскі падае гэткую схэму прабуджэньня нацыі да самабытнага існаваньня: „...У той час (да канца 18-га стагодзьдзя — заўв. аўтора) малая толькі жменя людзей, карыстаючых з палітычных прывілеяў, магла прымаць учасьце ў культуральным жыцьці і карыстаць з ягоных здабычаў. Пад уплывам вышэйшай або сільнейшай культуры суседа гэтая жменя (людзей) вельмі хутка дэнацыяналізавалася. Але вось новы ўзьвеў разбудзіў да грамадзкага жыцьця народныя масы, жывучыя дагэтуль у няволі, цемнаце і апушчанасьці; гэтыя масы пачалі змаганьне за свае правы і людзкі быт, складовай сучастнай каторага ёсьць культура. Селянін і работнік ня маюць ані часу, ані сродкаў, каб вынарадаўляцца, яны выцягаюць далоні да замкнёных для іх дагэтуль дзьвярэй сьвятыні культуры, але збуджаная цікавасьць да сьвету і да веды можа знайсьці заспакаеньне хіба толькі ў мове (нарэчы), якой гавораць ад калыскі, бо на навучэньне чужой мовы ня маюць часу, сродкаў і ахвоты. Запатрабаваньне родзіць ажыўленае вытворства і зьяўляюцца людзі, што патрэбы народу адчулі і жыцьцё сваё пасьвячаюць разьвіцьцю і пашырэньню роднай культуры. А калі з палітычных ці соцыяльных мяркаваньняў пачаліся абмяжовываньні і прасьледаваньні пашыраючайся асьветы, народная культура гуртавалася і мацнела, разьвіваючыся і разьцьвітаючы ў культуру і сьведамасьць нацыянальную. Не нацыянальная ідэя, знача, паднясла народ, — а сам народ, падносячыся грамадзка і духова, выкаваў новую зброю да змаганьня за поўнасьць жыцьця ў постаці нацыянальнай культуры, якая зьяўляецца для яго найлепшай успамогай духовага розьвітку“.

Можна мець — нават значныя — засьцярогі, што да высказаных тут пагляд аў аўтора. Тым ня менш нельга ня прызнаць яму вялікай долі слушнасьці.

„Аднак — кажа далей той-жа Т. Вр. — на разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці ўплываюць яшчэ іншыя чыньнікі. Зьмест людзкога супрацоўніцтва выпаўняецца спалучэньнем адна і розна іменных сіл: ня толькі супрацоўніцтвам, але і конкурэнцыяй. Росквіт нацыянальнай сьведамасьці ў XIX в. спадае ў адно з магутным росквітам капіталізму, аднэй з формаў концэнтрацыйных уласьцівасьцяў каторага зьяўляецца ідэя нацыянальнага спалучэньня. Найбольш істотнай патрэбай капіталістычнага ладу ёсьць заховываньне рынкаў збыту і падшуківаньне новых. Дзеля задаваленьня гэтых патрэбаў стараюцца і змагаюцца між сабой народы ўладаючыя і падуладныя. Гэтыя апошнія імкнуцца да абароны таго што маюць, да манаполю на ўнутраным рынку, а дзеля ўтрыманьня гэтага рынку дае вялізную ўслугу нацыянальная культура; гнаныя конкурэнцыяй, падуладныя народы будуць ня толькі пашыраць і падносіць гэту культуру і старацца аб утрыманьні ейных асаблівасьцяў, але і разбуджаць неахвоту і варожыя пачуцьці да ўсякай чужой культуры. Для народаў уладных, маючых сваю дзяржаву, унутраны рынак не хапае, ненасытны капіталізм вымагае новых рынкаў, перадусім рынкаў на тэрыторыях занятых народамі падуладнымі; для гэтай мэты найбольш стасоўнае аружжа стараюцца знайсьці ў занядбаньні і дэнацыяналізацыі падуладных нацыянальных меншасьцяў, а аружжа гэтага ўжываюць у імя нацыянальнай еднасьці.“ *)

(д. б.)

*) T. Wróblewski: Naród i samookreślenie narodowe, Вільня 1919 г., бач. 5-6.

Польшчы доступ да мора ў Гданску і разам з другімі дзяржавамі будзе рабіць стараньні, каб пагадзіць Літву з Польшчай коштам Клайпэды. Паводле гэтага дагавору Клайпэда была-б польска-літоўскай даменіяй. Латвія паводле гэтай весткі дала-б Польшчы доступ дя лібаўскага порту.

Надзвычайнае паседжаньне Міжнароднага Трыбуналу ў Газе адбудзецца 14 красавіка с. г. На гэтым паседжаньні будуць разглядаць польска-нямецкі канфлікт у справе нямецкага школьніцтва на Горным Шлёнску.

„Беларуская Крыніца" ў месяцы красавіку выйдзе: 15, 22 і 29-га.
Гэты нумар „Беларускай Крыніцы" мае 6 бачынаў і дадатак —„Прамова пасла Ф. Яроміча".

Да нас пішуць:

НАВІНЫ З БРАСЛАЎСКАГА ПАВЕТУ.

Цяжкое палажэньне сялян. Сялянства Браслаўскага павету цяпер знаходзіцца ў вельмі цяжкіх эканамічных варунках жыцьця. Заработкаў нідзе ніякіх. Прадукт земляробскі йдзе за нішто. А расходы вялікія. Падаткі не паменшалі, хоць і абяцалі ў часе выбараў Б. Б—кі, што падаткі ападуць.

Фабрычныя тавары не патанелі, хоць і цьвердзілі бэбэхаўскія крыкуны, што ўсё будзе танна. Жыцьцё пасьля „ўдачных" для Б.Б. выбараў анічуць не папраділася, а яшчэ больш завастрыўся крызыс гаспадарчы, хоць „апякуны" нашы і завяралі, што ўсё будзе добра і ўсім стане лёгка, як „ліста маршалка звыценжы."

Аб сучасным жыцьці на вёсцы ў Браслаўшчыне вымоўна сьведчыць наступны факт:

У апошнія часы па ўсей Браслаўшчыне была пашырана вестка, што 16 сакавіка с. г. прыедзе ў Браслаў латыскі агент і будзе набіраць людзей на работу ў Латвію. Паводле вестак вясковага бяздротнага тэлеграфу латыскі агент меў даць працу для некалькі сот браслаўчыкаў.

Прышоў чаканы дзень 16 сакавіка. У Браслаў напёрла народу з усяе Браслаўшчыны, кожны нарыхтаваўшыся на заработкі ў Латвію. Народу зышлося, як на які кірмаш. Даведаўшыся, што чаканы латыш знаходзіцца ў старастве, народ паваліў у старостава. І што-ж? Аказалася, што ў Браслаў прыехаў за колькінаццаць вёрст ад Браслава з Латвійскай дзяржаўнай тэрыторыі гаспадар і шукае сабе толькі 3-х работнікаў на сваю гаспадарку.

Гэты факт выклікае з аднаго боку і сьмех, але ён вельмі ярка ілюструе сучаснае палажэньне нашага сялянства ў Браслаўшчыне, які разам з усьмешкай выціскае і сьлёзы з вачэй. К.

Ікзазьнь. Нашаму ксяндзу Ганусоўскаму ніяк не ўдаецца залажыць „Стоважышэня Млодзежы Польскай." Ён над гэтым нямала ўжо поту праліў, пацее і цяпер, але дзела рук ягоных ніяк утрымацца ня можа. Праўда, гэтае „Стоважышэньне" ёсьць, але „стоважышэнцаў" толькі як на лякарства — арганісты і адзін шляхтун.

Ксёндз бедны і крычыць на нашу моладзь і лае за чытаньне „Беларускай Крыніцы," страшыць касьцельнымі карамі і робіць уплыў на старэйшых і пашырае „Наш Пшыяцель" — а Стоважышэньне" як пустое, так і пустое. Пад касьцёлам людзі „Нашага Пшыяцеля" разьбяруць, прынёсшы да хаты ўжываюць яго на распалку сырых дроў, а ад гэтага „стоважышэньню" нічуць не памагае. Дык так гэты твор рук ксяндза Ганусоўскага — „Стоважышэньне Млодзежы Польскай" і чэзьне з двума „стоважышэнцамі."

Так, беларусы ў польскія арганізацыі ня йдуць.

Дык пашырайма арганізацыю беларускую. Чытайма свае родныя беларускія газэты, а прыйдзе час, што і ксёндз у нас будзе беларус. Тады замест перашкаджаць беларускай справе, будзе нам памагаць і дараджаць, як найлепш. Толькі працуйма, а ўсё пераможам. Каталік.

Арэхаўка. Стогнуць нашы сяляне пад цяжарам жыцьця. Было благацьцё, а цяпер завяршылася. Многія паверылі агітатарам, што ўрад Пілсудзкага даруе падаткі і не стараліся заплаціць, а чакалі гэтай ласкі, дык цяпер сэквэстратары і курыцу апісваюць. А тут яшчэ і ў краме падаражэла, як сернікі і соль. Вось тут і жыві і разжывайся. Але і гэта будзе навукай для нашых сялян, што заўсёды трэба свой розум мець. Заўсёды трэба ісьці разам з сваімі людзьмі боту, а не старацца пану дагадзіць. І.

Марцінаўцы. Цёмная наша вёска, цёмная і наша моладзь. У вольны час зьбярэцца ў хату і давай іграць у карты. Нават і ў карты прызваіта гуляць ня можа, бо йграючы лаецца і часта б'ецца.

Дарагая моладзь, кідай пустату. Бярыся за больш карысныя заняткі. Выпішы сабе газэту. Чытай газэты і кніжкі. Праз газэты і кніжкі ты даведаешся, як трэба лепш гаспадарыць, што трэба рабіць, каб цябе ня крыўдзілі. Навучымся шанаваць сябе і людзей. Без асьветы чалавек дзічэе, а асьвета падымае чалавека вышэй. Дык прасьвячайся, моладзь, каб ня зьдзічэць! П.

ВЕСТКІ З НЯСЬВІСКАГА ПАВЕТУ.

Па вёсках Нясьвіскага пав. у апошнія часы агенты Польскага Выдавецкага Інстытуту вельмі заахвоцілі сялян купляць вялізарную кнігу „Лекаж Ратуёнцы Здрове." Агенты даведаўшыся, што сяляне вельмі слаба разьбіраюцца з польшчынай, знайшлі з гэтага выхад — пацешылі сялян, што гэтая кніжка надрукавана і па расейску. Гэты аргумант аднак нашых вяскоўцаў не пераконываў аб дабраце кніжкі. Пасьля гэтага агенты пачалі расхвальваць сваю кніжку яе „цудоўнасьцяй." Цьвердзілі, што маючы гэтую кніжку можна стацца „цудоўным" дохтарам. Чалавек маючы гэтую кніжку зможа лячыць людзей ад усіх хваробаў. А гэтае шчасьце каштуе толькі 70 зл. і то на раты, у рассрочку.

Знайшліся такія, што паверылі агентам і выпісалі кнігу „Лекаж Ратуёнцы Здрове" І што-ж? Кніжка выдана добра, на добрай паперы, мае нешта з 1000 ілюстрацыяў і добра апрацавана. Але каб селянін, які з мэдыцынай ня меў у жыцьці ніякае сутычнасьці, мог з гэтае кніжкі лячыць людзей, дык гэта варта сьмеху. Гэтая кніжка для лекара з мэдыцынскай навукай можа і мае якую вартасьць, але для селяніна, дык проста аніякая.

Сяляне, помніце, што купляючы кніжку заўсёды яе трэба перагледзець, ці яна падыходзіць да зразуменьня чытача; у працiўным выпадку—толькі бескарыснае марнаваньне грошай на недаступныя кніжкі. З.

Забойства ў часе сваркі. У в. Івачова, Нясьвіскага пав., у нядзелю 8.III. с. г. паўстала сварка між дзьвяма сем'ямі — Ш. і С, якая адбывалася пры сьведках цэлае вёскі. Сварка гэная закончылася вельмі трагічна. Назаўтра пасьля сваркі, якая не абыйшлася бяз бойкі, — памёр учасьнік сваркі стары чалавек С., які быў нямілаэрна пабіты праціўнікамі. Хто вiноўнік сьмерці С.— пакажа судовая справа.

Брыдка і стыдна за такія пастулкі. Ад гэтага трэба лячыцца. А лякарствам ад дзікасьці ёсьць прасьвета.

Дык выпісывайма родныя газэты, закладайма культурна-прасьветныя гурткі, адчыняйма бібліатэкі чытальні і прасьвячаймася. Зорка.

Пацешылі абяцанкамі. У в. Бухаўшчына, Нясьвіскага пав., у 1920 годзе быў вялікі пажар. Уся вёска тады згарэла да шчэнту. Страхоўкі ніхто не атрымаў тады, а такжа і ніякае ўрадавае запамогі не далі пагарэльцам. Некаторыя сяк-так адбудаваліся, а некаторыя чэзнуць і цяпер. У гэтай бядзе нашым сялянам многа хто радзіў словам, але чынам дык ані хто. Спасярод дарадчыкаў быў і такі, што дарадзіў, як атрымаць страхоўку. Казаў ён, што ў дзесятым годзе пасьля пажару трэба напісаць просьбу да Прэзыдэнта Польшчы, дык заплацяць страхоўку. Праўда, сяляне не прапусьцілі тэрміну і ў траўні 1930 г. падалі паданьне да Прэзыдэнта. З справай гэтай было ціха аж да выбараў у Сойм і Сэнат. За тыдзень прад галасаваньнем раптам прыехаў у вёску валасны пісар і загадаў пісацца на дармовае або з малой даплатай дрэва на адбудову. Пісаліся ўсе. Дзеля таго, што ня ўсе гаспадары вёскі ў той час былі дома, пісар наказаў, каб назаўтра прышлі ў гміну запісацца. Назаўтра, непапісаныя ў вёсцы, бягом паперлі ў гміну, каб не спазьніцца. Папісаліся ўсе — хто на хату, хто на хлеў, хто на гумно і г. д., а пісар нікому дрэва не шкадаваў і запісываў, хто колькі хацеў. Прайшлі выбары і гэтая справа ўзноў заціхла. Цяпер нашым сялянам стала ясна, што адведзіны пісарам нашае вёскі і абяцанкі дармовага дрэва на адбудову былі ня што іншае, як толькі падахвочаньне сялян галасаваць за „адзінку."

Кажуць, што гэты сьпіс валаснога пісара ляжыць цяпер у ваяводзтве. Няма ведама, што з гэтым далей будуць рабіць. Сяляне нашы цяпер ужо цікавяцца толькі, чым гэтая справа кончыцца. Некалі аб гэтай справе яшчэ напішу ў „Б. Крыніцу.
Бухаўскі.

Яшчэ ў справе беларускае школы. Вялікая-Бухаўшчына, Нясьвіскага пав. На бачынах „Бел. Крыніцы" ўжо пісалася аб тым, як нашы людзі дамагаліся беларускай школы, але з гэтых дамаганьняў нічога ня выйшла.
У канцы 1929 году нашы сяляне падалі школьным уладам 29 дэкларацыяў на 41 дзіця з дамаганьнем ператварэньня ў нас школы польскай на беларускую.

Пасьля розных допытаў і сьледзтваў праведзеных інспэктаратам школьным, у вёску прышло паведамленьне з Куратoрыі, што ў нашай школе надалей астаецца выкладовы „ензык паньствовы." Далей ужо захадаў ніякіх вяскоўцы не рабілі, ведаючы, што ўсюды сядзяць такія-ж самыя польскія чыноўнікі і ўва ўсіх установах тая-ж самая справядлівасьць і адзін закон.

Ня маючы куды зварачацца, сяляне далі гэтай справе пакульшто супакой. Аж раптам узварушыў гэтую справу вучыцель польскае школы ў нас. У пачатку школьнага году ён абвесьціў вучням, каб куплялі і беларускія падручнікі, бо будзе вучыць і пабеларуску.

Дзеці ўсьцешыліся і папрасілі бацькоў, каб купілі беларускія падручнікі. Але праходзіць зіма, а ў школе з боку вучыцялёў ня чуваць ані слова пабеларуску. Нездаваленьне ў вучняў і нараканьне бацькоў пашырыліся. Многія наракаюць нават на паўнамоцнікаў, якія падавалі дэкларацыі, кажучы, што быццам у гэтым віна іхняя. На мой пагляд, дык тут з нашых вяскоўцаў ніхто не вінават, бо ўсё было зроблена па парадку. Адна можа памылка з боку сялян была, дык гэта пры допытах, на якія ня трэба было йсьці, бо дэклярацыі былі завераны і па закону зробленыя.

Не зважаючы на тое, што нам не даюць роднай школы, дух беларускі ў нашых людзей, асабліва ў моладзі, што раз узмацоўваецца. А гэта ўжо ёсьць доказам, што мы, як беларусы, будзем жыць. Гэта зярнё нацыянальнае сьведамасьці ў душах нашай моладзі не засохне.

Чэсьць і слава табе моладзь нашая! У вашых душах гэтае беларускае зерне ўзросшы дасьць вялікі плод.

Старэйшыя не асягнуўшы сваей мэты, не павінны так-жа апускаць рук, а дамагацца далей сваіх правоў. Калі будзем усе заўзята працаваць над папраўкай свайго лёсу — прыйдзе час, што засьвеціць сонца і ў наша ваконца. Б.

ХВОРЫ ПАШТАР.

Вішнева, Вялейскага павету. Людзі родзяцца на сьвет з рознымі слабасьцямі — адзін мае слабасьць да чарачкі, другі да курэньня, іншыя да чаго другога; ёсьць такія, што маюць слабасьць да чужых рэчаў, але найцікавейшую, дык мае наш паштар Балеслаў Кажановіч, бо да... „Бел. Крыні-

081530

цы." Ніяк ён з гэтай газэтай ня можа расстацца. Пойдзеш па газэты, дык кажыць, што даў некаму, каб перадаць; папросіш кагонебудзь, каб прынёс (бо ёсьць вёскі, што ад пошты далёка — 7 вёрст, не заўсёды можна самому быць), дык пан Кажановіч „далікатна" паясьняець, што выдаецца толькі падпішчыку на рукі... Словам, так манэўруець, што трэба Богу дзякаваць, калі за некалькі месяцаў хаця адзін нумар газэты ўвідзіш.

Трэба было-б, каб на гэта зьвярнула сваю ўвагу Віленская Дырэкцыя Пошт і Тэлеграфаў і вылячыла-б як небудзь п. Кажановіча ад такой дзіўнай слабасьці.

Першая Ластаўка.

СЯЛЯНЕ І РАБОТНІКІ, АРГАНІЗУЙЦЕСЯ!

Сьвіслач, Ваўкавыскага пав. У ваколіцах нашага мястэчка жывуць сяляне беларусы. У мястэчку ёсьць ня мала работнікаў. Сяляне ў большасьці каталікі, сярод каторых слабаватая народная сьведамасьць. Сьвіслацкія работнікі, так як і ўсе работнікі, мала цікавяцца справай народнай, а больш усяго соцыяльным забесьпячэньнем. Аднак і гэтая справа сярод нашага Сьвіслацкага работніцтва вельмі слаба пастаўлена; можна сказаць, што ў гэтым кірунку нічога ня зроблена і нічога ня робіцца. Нашы работнікі ня маюць у Сьвіслачы нават свайго работніцкага саюзу. Словам, тутэйшыя сяляне і работнікі жывуць хто сабе, бяз ніякай арганізацыі. А гэта ня добра, бо ня ўмеюць і ня могуць бараніць сваіх правоў. Апрача гэтага не разьвіваюцца, а чэзнуць умыслова.

Жыцьцё-ж людзкое пабудавана так, што без арганізацыі ані руш. Аб гэтым многія ведаюць і на сваей скуры адчуваюць з пасярод работнікаў і сялян, але ніхто ня возьмецца да арганізацыі, каб супольна змагацца з усялякімі бедамі. Браты сяляне і работнікі, закладайма свае беларускія арганізацыі! Закладайма сьпярша культурна-прасьветную арганізацыю Беларуск. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, у якой разам сяляне і работнікі ўзбагачываліся-б у сьведамасьці аб патрэбе лепшага жыцьця. Побач з гэтым трэба так-жа мець работнікам свой прафэсыянальны саюз, які бараніў-бы правоў работніка. Каб лягчэй прыступіць да гэтае працы, выпісывайма сваю родную газэту „Б. Крыніцу" і пішам у яе рэдакцыю ўсе нашы крыўды і нашы недахопы. Пры помачы газэты і праз свае арганізацыі зможам паправіць свой лёс.

М. Л.

ТРЭБА ВУЧЫЦЦА ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

Баяры, Шчучынскага пав. Самаўрад у жыцьці грамадзкім — вялікая рэч. Самаўрад — гэта дзейнік, якім кіруецца гаспадарчае жыцьцё данае мясцовасьці. Дзеля таго, што самаўрадавыя інстытуцыі павінны кіраваць справамі грамадзкімі, ня можа быць там месца для спраў асабістага характару самаўрадаўца. Тымчасам у нас бывае наадварот — нясьведамы чалавек, папаўшы ў самаўрад, уважае, што самаўрадавая інстытуцыя — гэта яго крамка, або крама, якой ён зьяўляецца супольнікам. Гэтакі сябра самаўраду вельмі шкодны для інстытуцыі.

Ёсьць і ў нашай вёсцы адзін экзэмпляр такога самаўрадаўца. У паняцьці гэтага чалавека — самаўрад — гэта самаволя.

Браты сяляне, выбіраючы людзей у самаўрады, мы не павінны заглядацца на гаспадарку кандыдата, ці на тое, як аб ім гаворыць паліцыя, гміна і паны, а прадусім цаніць яго розум, сумленьне і грамадзкасьць. Ад кепскіх самаўрадаў церпім у першую чаргу мы самі. Ня маючы ніякага паняцьця аб грамадзкіх справах, наш прадстаўнік таўчэцца ў самаўрадзе, як таўкач у ступе, асьмяшаючы сябе і нас. Мала таго, такі экзэмпляр у многіх справах шкодзіць грамадзкай справе, з чаго вынікаюць і шкоды для нас. Дык заўсяды выбірайма ў самаўрады людзей разумных, чэсных і з паняцьцем грамадзкасьці.

Р.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!"

Ab haspadarcy.

Haspadarskaja snaść da abrablańnia hleby.

Usio mechaničnaje abrablańnie hleby ŭ istocie svajej zvodzicca da pieravaračyvańnia hleby i da raskryšeńnia i pieramiašańnia baraźnianaj śkiby. Pieršuju čynnaść, h. zn. pieravaračyvańnie, vykonuje płuh.

Najbolš istotnaj sučastkaj płuha źjaŭlajecca n a r o h i p a l i c a, asabliva-ž heta apošniaja. Ad formy i vialikaści palicy zaležyć usia praca płuha. Pieršapačatnaj formaj palicy była h. zv. palica š r u b o v a j a, bo jana była vyhnuta ŭ formie vialikaha šruba. Płuha z šrubovaj palicaj užyvajecca i da siahońnia ŭsiudy tam, dzie ad jaho vymahajecca tolki pieravaračyvańnie baraźnianaj śkiby, napr. pry miełkim zavoryvańni aržyšča, zavoryvańni hnoju i h. d. Zatoje ŭsiudy tam, hdzie apračа pieravaračyvańnia baraźnianaj śkiby, treba byvaje hetu śkibu razam i r a s k r y š y ć, tam užyvajecca płuha z palicaj roŭna-kruhłaj, h. zv. v a l c a v i t a j. Baraźnianaja śkiba nie źjaždžaje tak roŭna pa valcavitaj palicy, jak heta maje miejsca pry palicy šrubovaj i tamu zmušana byvaje kryšycca. Heta kryšeńnie baraźnianaj śkiby dziejecca adnak zvyčajna koštam jejnaha, nia tak dakładnaha pieravaračyvańnia. Apračа taho ŭžyvańnie płuha z palicaj valcavitaj abmiažovana i tym, što vymahaje značna bolšaj siły ad žyvioły ciahnučaj płuh i tamu, asabliva ŭ hlebach bolš viazkich (hlaistych, hlinistych), užyvańnie hetaha płuha časta byvaje susiom niemahčymym.

Usio heta razam uziataje zhary byccam dzielić užyvańnie płuhoŭ u zaležnaści ad charaktaru hleby, dla katoraj jany praznačany: na hlebach viazkich, ciažkich užyvajucca płuhi z palicaj šrubovaj, a na hlebach lahčejšych—płuhi z palicaj valcavitaj. Lišnie było b dadavać, što kožny haspadar, a ŭ najhoršym razie dva, najvyšej try haspadary na supałku musili-b mieć abo-dva vyšejapisanyja płuhi.

Dla miełkaha zavoryvańnia aržyšča vielmi cennyja ŭsłuhi daje h. zv. dvajak, a navat trajak (płuh z dźviumia — trymia šrubavymi palicami: rabota hetymi płuhami idzie vielmi chutka i spraŭna.

Rešta haspadarskaj snaści praznačana pieravažna da raskryšeńnia ziamnych hrudkaŭ. Pieršaj — a na Biełarusi, na vialiki žal, amal i adzinaj snaściaj jošć barana. Majem pry hetym naŭviecie baranu žaleznuju. Asnaŭnymi sučastkami barany źjaŭlajucca ramy, žaleznyja, abo dzieraŭlanyja i žaleznyja zuby. U zaležnaści ad taho da jakoj pieravažna pracy byvaje barana praznačana, forma jejnych zuboŭ i sposab ichnaha raźmiaščeńnia byvajuć roznymi. Dziela razdrableńnia baraźnianaj śkiby zuby barany musiać być i vuziejšyja i vastrejšyja, a dla pieramiašańnia hleby i vybaranavańnia z jaje pyrniku i inšaha ziella lepšaj budzie barana z zubami šyršymi i tupiejšymi.

Hłybka, da katoraj zuby barany zasiahajuć u ziamlu, zaleža jak ad vahi samoj barany, tak i ad formy jejnych zuboŭ i ichnaha prymacavańnia da ramy. Što da ciažyni barany, dyk znajem barony lohkija, siarednija i ciažkija. Apračа sposabu rassartavańnia baron pavodle ciažkaści padanaha vyšej, varta tut jašče zaznačyć, što l o h k i m i baronami ličacca takija, u katorych na adzin zub prypadaje 1,0 — 1,5 kg ahulnaj vahi barany; napr. barana z 20-ciu zubami, važyć moža 20—30 kg. U baronaŭ siaredniaj ciažkaści na adzin zub prypadaje 1,5—2,0 kg., a ŭ ciažkich—2.0 — 3.0 kg. ahulnaj vahi całaj barany. Zrazumieła, što mova tut ab baronach z žaleznymi ramami. Apračа ahulnaj ciažkaści barany važnym jošć forma zubu: u ziamlu lepš lezie zub zrezany z adnej tolki tylnaj starany, čymsia zub zavostrany ŭ formie dałata (z usich staron). Urešcie zub asadžany ŭ ramu z nachiłam krychu ŭpierad — adnak nia bolš jak na 60° — bolš lezie ŭ ziamlu, čymsia zub asadžany ŭ ramu stаčma. Daŭžynia zuboŭ u barany lohkaj vynosić 10 cm., u siaredniaj — 10 — 20 cm. i ŭ ciažkoj — 15 — 30 cm., ahulnaja-ž hłybka zabaranavańnia kałyšacca ŭ hranicach ad 2 da 12 cm. Pry nastaŭlańni barany treba hladzieć, kab ślady astajučyjasia za paasobnymi zubami byli roŭnamierna ad siabie addalenymi: dla lohkich baron heta addalenaść vynosić 2—3 cm., dla siarednich — 4—7 cm. i dla ciažkich—5-8 cm.

Kali i jakoj barany ŭžyvać? Receptu viečna važnaha dać nielha. Ahułam-ža: dla ciažejšych hruntoŭ—barony ciažejšyja, a dla lahčejšych — lahčejšyja. Charaktar pracy taksama maje na heta ŭpłyŭ: razdrablańnie i vyroŭnyvańnie pavierchni hleby najlepš dakanaje barana lohkaja.

Dla razbaronyvańnia adnak baraźnianych śkibaŭ mała raskryšanych, dla zabaronyvańnia bolšych ziarniat nasieńnia i štučnych hnajoŭ, dla vybaronyvańnia ŭsiakaha škodnaha ziella treba ŭžyvać baron ciažkich.

Apračа baron ahulna znanych, z zubami, jošć jašče amerykanskija barony h. zv. t a l e r k i, dzie hleba razrazajecca i pieramiešyvajecca zamiest zuboŭ — kruhłymi nažami, prypaminajučymi saboj talerki, ad katorych dastali i svoj nazoŭ: pryhodny pierad usim na hlebach ciažejšych i časta mohuć zamianić saboj navat płuh.

Siam-tam spatykanyja ŭžo i ŭ nas spranžynovyja barony i kultyvatary taksama źjaŭlajucca niečym pierachodnym pamiž płuham i baranoj.

Na asobny ŭspamin zasłuhoŭvujuć barony ŭžyvanyja na sienažaciach, h. zv. skaryfikatary, jakija zamiest zuboŭ majuć na hłucha ŭ ramu ŭstaŭlenyja nažy, katorymi razrazajuć dziarno i dapuskajuć tudy pavietra.

Ab značeńni vałavańnia i snaści da hetaha, vałach, abo vałkach, była mova raniej. Treba tolki tut jašče zatrymacca nad ahulnym apisańniem v a ł a č y ł a, značeńnie katoraha było taksama ŭžo padana vyšej. Voś-ža najpraściejšaje vałačyła składajecca zvyčajna z 3-ch papiarečnych, vostra kanciastych belačak, miž saboj u adlehłaści 20-30 cm. ruchoma spałučanych (źviazanych). Zamiest hetaha ŭžyvajecca časta troch, pobač siabie źviazanych, ciažkich žaleznych abručoŭ, abo šynaŭ ad kałos.

Z inšaj snaści, na jakuju pastupovy haspadar musić uzdabycca, jošć siejałka. Patrebna jana ziemlarobu abaviazkova i vielmi chutka sama siabie apłačyvaje.

Pry kancy zaznačyć treba, što naša ziemlarobstva vielmi biedna na haspadarskuju snaść. Stul niama dziva, što tak niskija i našy ŭradžai. Biez naležnaha abrableńnia hleby nie pamohuć ni dobraje nasieńnie, ni štučnyja hnai, ni melioracyi... Adnaho-ž tolki płuha, barany na heta chapić nia moža... Sam drobny haspadar ŭsiej patrebnaj snaści spravić nia ŭ siłach: vialikaja i ŭdziačnaje tut pole pracy dla kooperatyŭnych h. zv. mašynovych supałak i dla pažyčalniaŭ haspadarskaj snaści.

inž. A. K.

Наша пошта.

Каталіку. Атрымалі, дзякуем друкуем, пішыце больш.

Селяніну. Атрымалі, дзякуем, скарыстаем. Кніжкі выслаць можам толькі атрымаўшы грошы.

Ф. Кузьмічу. Дзякуем, скарыстаем, пішыце больш. Кніжкі высылаем атрымаўшы грошы, бо і мы іх купляем у кнігарні.

Б. Гіндзіну. Атрымалі, скарыстаем, просьбу споўнілі — перадалі ў Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры.

Лаўрыновічу. Верш Ваш да друку не падходзіць, слабая форма і мае лёкальны характар. Пішыце весткі караспандэнцыяй. Кніжак бяз грошай выслаць няможам. Пашырайце газэту, як усьведамяцца, сьмяяцца будуць з сябе.

Коко. Дзякуем. У „Шл. Моладзі" перадалі.

Беларускі Загранічны Архіў у Праве. Просьбу спаўняем.

Патрэбічу. Дзякуем, скарыстаем, пішыце больш.

Ровбуцю. Скарыстаем у наступных нумарох.

Сын Беларусі. Скараціўшы скарыстаем.

Асіповічу. Дзякуем, скарыстаем.

Тумашу. Скарыстаем, ужытак з копіі зробім. Пад апаскай Вам газэту паслалі нумар 11.

Вількоўшчыку. Матэр'ялы атрымалі, падрабязна адказ вышлем пісьмом.

Грошы атрымалі ад: Далецкага 10 зл., Навасельскага 2 зл., Пупіна 1 зл., Кашубы 1 зл., Каршуна 2 зл., Міхаэля 1 зл., К. Татарыновіча 5 зл., Ліхуты 1 зл. 50 гр., Верцінскага 4 зл., Сулевскага 2 зл, і Трыпуцькі 2 зл. Дзякуем, прэмію пасылаем.

Вышла з друку і прадаецца новая кніжыца:

„Палітычныя і грамадзкія кірункі у мінуўшчыне і сучаснасьці"
(Адбітка з „Шляху Моладзі")

Кніжыца прадаецца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях і каштуе 50 гр.

Галоўны склад: Беларуская Кнігарня „Пагоня", Вільня, Людвісарская вул. 1

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч

Дадатак да „Бел. Крыніцы“ № 12, 1931 г.

Прамова
пасла Ф. Ярэміча
сказана ў Сойме дня 9 лютага с. г. учасе дыскусіі над дзяржаўным буджэтам.

I.

Высокая Палата. Сучасны дзяржаўны буджэт прынёс для беларусаў новую неспадзеўку. Буджэт мінулага году хоць і незаспакоіў цэласьці слушных нашых дамаганьняў школьных, то ўсёж такі было прызнана 500.000 злотых, каб можна было запачаткаваць беларускае школьніцтва. Сучасны ўрад ня толькі не пайшоў у гэтым кірунку, дзеля заспакаеньня найістатнейшай патрэбы беларускага народу, але наадварот, усё тое, што было ў жыцьці школьніцтва— загамаваў, тое што Сойм пастанавіў... (П. Косыдарскі: А якімі галасамі пан прайшоў у Сойм). Я прайшоў беларускімі і украінскімі галасамі, а пана прыслала сюды паліцыя і адміністрацыя. Я зьяўляюся выбраным, а не пасланым. (П. Косыдарскі: Пан прайшоў пэ сьпіску дзяржаўным). І аб гэтым скажу.

Вось-жа сучасны ўрад не выканаў таго, што парлямант у мінулым годзе пастанавіў, а іменна не выканаў буджэту, каторы быў ухвалены ў папярэднім Сойме, нават некаторымі галасамі Б.Б. Не выбудавана бурса,

скі народ п. Тадэўш Голувко і вайсковыя асаднікі.

Пане старшыня Голувко! ад народу сілай можна адабраць усё. Ад народу беларускага забрана зямля і аддана асаднікам. Найлепшых сыноў Беларускага Народу ўкінена ў вастрог, або выгнана на баніцыю (ці за межы Бацькаўшчыны). ,,Голас на лавах ББ“: або самі ўцяклі. Так, або самі ўцяклі ад тэрору. Беларускія дзеці сілай пасылаюцца ў польскую школу а беларусы за гэта плацяць. Забіраецца апошні кажух за падаткі. Але п. старшыня Голувко і п. мін. Складкоўскі, душы народу беларускага не забярыцё, бо гэтага забраць немагчыма. Гэтага дык не даканаеце!

Народ Беларускі перажываў вельмі цяжкія часы і прад гэтым, перэтрывае і цяпер. Наступіць час, калі народ беларускі прыпомніць аб сваіх правох. Вось гэта мэтоды ўрадаваньня — мэтод тэрору, дэправацыі не каторых з грамадзян Беларускага Грамадзянства, аб усім гэтым п. Ст. Голувко дужа добра ведае. Пан загаляпаваўся выконваючы кантынгент паслоў з гэтак зв. ,,паўночнаўсходніх крэсаў“ не прапусьціўшы ў Сойм ніводнага пасла беларуса, тады, калі ў папярэдніх Соймах было беларускіх прадстаўнікоў 13, 14. Гэта заслуга пана. Але заяўляю, што гэткім спосабам вы паны справы беларускай ня вырашыце. Вы думаеце, пане Голувко, што як ня будзе ў Сойме беларусаў, дык і гэтым вырашыцца беларуская справа. Беларусы ня мелі сваіх прадстаўні-

коў і ў „Государственной Думе“, аднак жылі, жывуць і дамагаюцца сваіх правоў.

II.

Забіраю голас дзеля таго, каб адказаць п. старшыні Голувку. Зьяўляюся ня ў роўным палажэньні, бо я маю часу на прамову толькі 4 мінуты, а п. Голувко мог гаварыць сколькі хацеў. Але мушу адказаць хоць на некаторыя закіды.

Не правялі мы ані воднага пасла. Але не правялі дзеля таго, што п. Голувко быў эмісарам выбарным падтрымліваючай урад партыі. Прыгэтым пакасаваныя былі амаль усе нашыя сьпіскі (Голас на лавах Б. Б. Хлусьня). Пакасаваны ў Беластоку, Пінску, Берасьці, Лідзе, Остраве і Горадні. Скасаваны так-жа некаторыя кандыдатуры ў Нанаградку. Астаўся наш сьпісак толькі ў Сьвянцянскім вокрузе.

П. Голувко закідае мне, што я не адкрыў аніводнае коопэратывы. Так. Але-ж пан старшыня сам пацьвердзіў, што да 1926 году мы былі «вне закона» і нас недапускалі да нічога, як ня пэўны элемэнт і г. д. Праўду кажучы, ня лепш ёсьць і пасьля 1926 г. (П. Голувко: Незгаджаюся з вашымі поглядамі) Але на жаль так ёсьць. Не маглі мы тварыць коопэрацыі, бо перажывалі сярэднявечныя інквізыцыі паліцэйскіх пастарункаў ды праходзілі праз працэсы і турму. Адбылося каля 1000 працэсаў і тысячы беларусаў у працягу апошніх

на якую Сойм прызнаў 200.000 зл., выдана толькі 60.000 зл. Ані граша не выдана на падручнікі, на якія было прызнана 50.000 злотых. Не адкрыты вучыцельскія курсы. Што праўда адкрыта вучыцельская сэмінарыя, але далёка яна ад патрэб беларускіх, хоць і пішацца аб ёй, што яна нібы беларуская, але фактычна ёсьць польская.

У цяперашнім буджэце мы нямаем на беларускае школьніцтва анічагусенькі. Маем толькі падаткі, падаткі і яшчэ раз падаткі.

Ад імя беларускага народу буду галасаваць процiў буджэту.

А цяпер скажу некалька слоў аб Берасьню.

Высокая Палата. Берасьць для польскага грамадзянства паўстаў толькі ў 1930 г. Для нас, Берасьць існуе з гарой 10 гадоў. Ад якога часу знаходзімся пад Польшчай, ад тае пары для нас існуе Берасьць. Не аднойчы мы гаварылі аб гэтым. Не адзін раз гаварылі мы аб нялюдзкім біцьці і сярэднявечным катаваньні. Але нам адказвалі, што мы ёсьць здраднікі Дзяржавы і хочам «шкаляваць» добрае імя Польшчы заграніцай. Настаў 1930 г., настаў час, калі кій, каторым білі нас, а можна было біць толькі народныя меншасьці, прадусім меншасьці тэрыторыяльныя — апынуўся ў іншых руках. Гэты кій ня менш б'е нас і цяпер, але ўжо гэты кій дастаў і тых паноў, каторыя першыя завялі сыстэму біцьця. Гэты кій заведзяны праз Вас паны, праз эндэцыю, дык сяньня вы паны так моцна не пратэстуйце.

Я працiўнік усялякіх зьдзекаў і спачуваю тым людзям, каторыя гэтага дазналі, а гэта былі калегі з папярэдніх соймаў, але можа і добра сталася ў Польшчы, што і польскае грамадзянства даведалася, што значыць Берасьць.

Цяпер таксама, як і даўней: калі мы скаржыліся і гаварылі аб біцьці і зьдзеках, вы сьмяяліся, сяньня пасол Жулаўскі казаў — глядзіце, якія яны маюць здаволеныя міны, як сьмяюцца. — Гэта сяньня слухаючы гэткіх скаргаў усьміхаюцца падтрымліваючыя ўрад партыі.

Няведаю, калі будзе існці ў гэтым кірунку далей, магчыма што за пару гадоў будуць пасьміхацца тыя, якіх у гэтай Палаце ёсьць толькі 4, калі хто з Вас адважыцца тады выступіць проціў (паказваючы на лаву камуністаў).

Вывад з гэтага. Калі паны хочаце, каб у Польшчы ня было «Берасьця», дык гэта знаходзіцца ў вашых руках. Калі будзеце змагацца, каб у Польшчы» Берасьця» ня было для нікога, у змаганьні гэтым будзеце мець нас сваімі саюзьнікамі.

Цяпер пане старшыня Голувко аб выбарах.

Пан у мяне пытаў хто мяне паслаў? Мяне паслаў беларускі народ! А я пытаюся пана старшыні: хто паслаў пана? (П. Галувко: Выбаршчыкі). Пана паслалі: ваяводы, старасты і паліцыя, толькі не народ. Дзеля гэтага і стаўся сучасны парадокс, што ў цяперашнім Сойме рэпрэзэнтуюць белару-

10 гадоў сядзела ў турме. (Голас на лавах Б.Б.: Дзеля таго, што пан іх так узгадаваў).

Пан старшыня дараджае мне паехаць да п. Рудніцкай вучыцца, як закладаць кооперацыі. Але штож вы паны зрабілі з кооперацыямі ў Зах. Украіне падчас пацыфікацыі? Пана міністра Складкоўскага людзі і гавай паабліваюць усе тавары? Калі так будзе далей дык і Украінцы ня будуць мець ані аднае коопэратывы.

Далей пан старшыня гаварыў аб школьніцтве.

Вось-жа я зьяўляюся адзін між тымі, каторыя думалі, што нарэшце можна будзе хоць думаць аб супрацоўніцтве ў гэтым кірунку, а магчымасьць для гэтага супрацоўніцтва будзе супольным варштатам школа, дзе будзе магчымасьць спаткацца беларускаму грамадзянству з польскім.

На жаль, пане старшыня, гэнае магчымасьці няма. Да сяньняшняга дня нам школ не давалі. Калі беларусы цяпер маюць 24 школы на 2 з гарой мільёнаў насельніцтва — а ўрад сам пацьвярджае, што беларусоў ёсьць 1 мільён 100 тысяч, дык няўжож са школьніцтвам усё ўпарадку?

Да гэтага, яшчэ нядаўна п. Прэзыдэнт выдаў дэкрэт, які адабраў у нас нават магчымасьць дамаганьня роднае школы. (П. Голувко: А ў чыіх руках Т-ва Беларускае школы). А дзе ёсьць урад. (П. Голувко: Есьць у руках камуністаў, праўда?) А дзе ўрадавае паўшэхнае школьніцтва, а дзе дэкларацыі на 412 школ, якія ў 1925-26 годзе

мы падалі, ці ўрад адкрыў хоць адну школу?

Пан старшыня кажа, што мы ўсе належым да камуністаў ці камунізуючага элемэнту і дзеля гэтага былі цакасаваныя выбарныя сьпіскі. Заяўляю, што да камуністаў і камунізуючага элемэнту не належаў (Голас: Агітатарам пан быў). Паночку, Паночку, маўчы пан, на міласьць Бога — шкода пану адказваць.

Маршалак: Пане пасол, пяць мінут ужо прайшло.

Ярэміч. Рагуля ня быў камуністам, а суд польскі засудзіў яго на 2 гады катаргі. (Голас: Але за што — за надужыцьці). Нічога падобнага, з 129 арт. к. к.

Калі пан старшыня Голувко кажа, што ўсё ўпарадку, дык гэта вынікае толькі з таго, што пан старшыня ўжо ад сваіх «прыгожых» артыкулаў у «Дродзэ» дайшоў да сяньняшняй сваей прамовы і пісаньня ў „Кур,еры Віленскім“ артыкулаў. Красноў калісь пісаў: Ад „двуглавага арла“ да краснаго „знамені“, а п. старшыня дайшоў ад чырвонага сьцягу да чорнай кашулькі.

Выданьне Ф. Ярэміча.
Бел. Друкарня ім. Фр. Скарыны ў Вільні.

кі. або сільнейшай культуры суседа гэ-
т (людзей) вельмі хутка дэнацыяна-

вялікай долі слушнасьці.
„Аднак — кажа далей той-жа Т. Вр.
— на разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомась-

*) T. Wróblewski: Naród i samookreślenie narodowe, Вільня 1919 г., бач. 5-6.